

Я. І. Талкачоў

— Слухаю цябе, Жэня,— гаварыў, адчыняючы дзверы, Мікалай Казарэз, падпольшчык, камуніст.

— На вуліцах устаноўлены вітрыны для загадаў нямецкай камендатуры,— гаварыў напаўголаса хлопчык.— Зачыняюцца яны сеткай з дроту, замкі нескладаныя. Вакол камендатуры калючы дрот...

Затым Талкачоў запісваў зводкі Саўінфармбюро, а ноччу прабіраўся да вітрын, адмыкаў іх і на загады камендатуры наклейваў свежыя зводкі.

Аднойчы падпольшчыкам стала вядома, што з Жытоміра прыбыў у Мазыр фашысцкі палкоўнік, які павінен быў праводзіць у гарадскім тэатры нараду афіцэраў СС і гестапа.

— Нельга дапусціць, каб наш горад ператварыўся ў нямецкі адміністрацыйны цэнтр, дзе будуць прымацца рашэнні аб сумесных аперацыях супроць партызан і мірных жыхароў,— гаварыў камандзір падпольнага цэнтра К. М. Бакун.— Трэба сарваць сустрэчу.

Хутка ўзнік план. Аперацыю было даручана правесці Дзмітрыю Казлоўскаму, Яўгену Талкачову і Канстанціну Катлінскаму.

За некалькі гадзін да пачатку нарады Жэня прабраўся ў памяшканне тэатра. Ён ужо ведаў, што там, у правым крыле, стаялі бочка з пакостам і фарба. Ды і з сабою захапіў сяго-таго...

А калі ў зале загрымела «Хайль Гітлер!», Жэня запаліў пакост і фарбу. Сцены да гэтага абліў бензінам...

Вартавыя, убачыўшы, як з вокан тэатра паваліў дым, адкрылі стральбу. Нарада немцаў была сарвана.

У сярэдзіне студзеня 1942 г. падпольшчыкі даведаліся, што праз 3—4 дні ў Акцябрскі раён выедуць карнікі. Трэба было папярэдзіць партызан. Выканалі гэта заданне Кузьма Бакун і Жэня Талкачоў. Партызаны змаглі падрыхтавацца да «сустрэчы».

Шмат смелых аперацый было на рахунку юнага падпольшчыка. Адна з іх — удзел у падрыве электрастанцыі.

Пазней Жэня з'яўляўся ў Мазыры, але ўжо па заданні партызанскага атрада, дзе ён змагаўся. Загінуў Яўген Талкачоў пад Калінкавічамі ў няроўным баі з фашыстамі.

*Ю. Герасіменка*

## Удзельнікі антыфашысцкага падполля, якія змагаліся на Мазыршчыне і загінулі на тэрыторыі раёна і за яго межамі

### Група партыйна-савецкага актыву, пакінутая партыйнымі органамі ў тыле ворага ў 1941 г.

**АНТОНЕНКА Іван Рыгоравіч,** н. у 1900, старшыня калгаса ў в. Каменка. У кастрычніку 1942 уступіў у партызанскае злучэнне С. Каўпака, загінуў у 1943 у Кіеўскай вобл.

**ГАФШТЭЙН Шалом Меeравіч,** н. у 1893, старшыня калгаса ў в. Чарамашня, закатаваны ў 1941.

**ГНЕДЗЬКА Дзяніс Максімавіч,** н. у 1901, старшыня калгаса «Мазыршчына» ў в. Слабада, расстраляны ў студзені 1943.

**ДУБАВЕЦ Мікалай Адамавіч,** н. у 1910, старшыня Мялешкавіцкага сельспажыўтаварыства, расстраляны 8.1.1942.

**КАМЯНЕЦКІ Фёдар Апанасавіч,** н. у 1893, нам. старшыні райвыканкама, расстраляны 8.1.1942.




Помнік загінуўшым падпольшчыкам (у двары СШ № 4 г. Мазыр)

**КАРПАЎ Іван Якаўлевіч,** н. у 1915, інструктар упраўлення міліцыі Палескай вобласці, расстраляны ў лістападзе 1941.

**ЛАГОЎНІК Іван Іванавіч,** н. у 1900, старшыня Баброўскага сельсавета, расстраляны ў 1942.

**ЛУК'ЯНОВІЧ Захар Іосіфавіч,** н. у 1901, старшыня Прудкоўскага сельсавета, расстраляны 30.8.1942.

**ЛУТЦ Лізавета Лявонцьеўна,** н. у 1885, сувязная партызанскага атрада, расстраляна 24.9. 1941 на плошчы ў г. Мазыр.

**ЛУТЦ Юліс Отавіч,** н. у 1880, заатэхнік райземаддзела, сувязны партызанскага атрада, расстраляны 24.9.1941 на плошчы ў г. Мазыр.

**ЛЯВОНАЎ Карп Яўціхіевіч,** н. у 1910, старшыня калгаса ў в. Раманаўка, расстраляны ў жніўні 1942.

**ЛЯВОНАЎ Рыгор Яўціхіевіч,** н. у 1912, старшыня калгаса «Праўда», расстраляны ў жніўні 1942.

**МІЦУРА Іван Абрамавіч,** н. у 1890, старшыня калгаса ў в. Бабры, расстраляны ў жніўні 1942.

**ПАДЛОБНІКАЎ Павел Васілевіч,** н. у 1910, загадчык Казіміраўскай пачатковай школы, расстраляны 8.1.1942.

**СІТНІК Яўхім Данілавіч,** н. у 1901, старшыня Скрыгалаўскага сельсавета, расстраляны 20.1.1943.

**УЛАСЕНКА Мікалай Філімонавіч,** н. у 1904, сакратар Каменкаўскага сельсавета, у лістападзе 1942 уступіў у партызанскае злучэнне С. Каўпака, загінуў 18.3.1943 у Кіеўскай вобл.

**УРЭЦКІ Ханон Айзікавіч,** н. у 1904, старшыня калгаса «XVII партз'езд», расстраляны 18.1.1942.

**ЧУБ Максім Мікалаевіч,** н. у 1895, старшыня Казіміраўскага сельсавета, расстраляны ў студзені 1942.

## Падпольшчыкі, пакінутыя органамі дзяржбяспекі ў тыле ворага ў 1941 г.

**БАЛЕЎ Даніла Іванавіч,** н. у 1907, шавец, расстраляны ў студзені 1943.

**БЕЛЕНЬКІ Фока Рыгоравіч,** кіраўнік групы са жніўня 1941 па снежань 1942, расстраляны ў студзені 1943.

**ЗАГОРСКІ Мадэст Васілевіч,** н. у 1911, рабочы мясакамбіната, расстраляны ў студзені 1943.

**КАНАШ Яфрэм Аляксеевіч,** н. у 1900, начальнік пажарнай каманды аблгандлю, расстраляны ў жніўні 1942.

**КРЫЦКІ Васіль Іванавіч,** н. у 1893, бухгалтар аблвыканкама, кіраўнік групы, расстраляны 30.8.1942.

**КУЗМІЧ Аляксандр Пятровіч,** н. у 1901, бухгалтар аблвыканкама, расстраляны ў студзені 1943.

**МАЙСЕЕЎ Міхаіл Ульянавіч,** н. у 1906, механік порта Пхоў, расстраляны ў верасні 1942.

**МІХАЙЛАЎ Уладзімір Іванавіч,** н. у 1898, дэкаратар абласнога тэатра, расстраляны ў студзені 1943.

**ПАЛЯКОЎ Архіп Паўлавіч** (Прымакоў А. П.), н. у 1909, оперупаўнаважаны Кольнаўскага райаддзялення дзяржбяспекі Беластоцкай вобл., кіраўнік падпольных груп органаў дзяржбяспекі ў Мазыры са жніўня 1941 па верасень 1942, расстраляны ў кастрычніку 1942.

**ПАПРАЦІНСКАЯ Аўгуста Густаваўна,** н. у 1885, настаўніца нямецкай мовы, расстраляна ў кастрычніку 1942.

**ПАШКОЎСКІ Арсень Іосіфавіч,** н. у 1902, бакеншчык на р. Прыпяць, расстраляны ў снежні 1943.

**СІЛІВОНЧЫК Яўген Уладзіміравіч,** н. у


В. І. Крыцкі


М. У. Майсееў


М. С. Казарэз


С. П. Раднеўскі


У. І. Міхайлаў


А. Г. Папрацінская


І. М. Лапета

1895, старшы бухгалтар сплаўканторы, расстраляны ў верасні 1942.

**СУЗЬКО Аляксей Піліпавіч,** н. у 1908, рабочы, расстраляны ў жніўні 1942.

**ТКАЧ Кандрат Радзівонавіч,** н. у 1910, настаўнік Жахавіцкай пачатковай школы, расстраляны ў ліпені 1942.

## Група Д. А. Казлоўскага

**КАЗАРЭЗ Мікалай Сцяпанавіч,** н. у 1908, інструктар Палескага абкама КП(б)Б, расстраляны ў сакавіку 1942.

**КРУКОЎСКІ Антон Іванавіч,** н. у 1923, супрацоўнік аблза, расстраляны ў студзені 1943.

**РАДНЕЎСКІ Сяргей Паўлавіч,** н. у 1908, начальнік аддзела Мазырскай электрастанцыі, расстраляны ў верасні 1942.

**СУРКОЎ Андрэй Піліпавіч,** н. у 1896, прараб будтрэста, расстраляны ў сакавіку 1942.

**ТАЛКАЧОЎ Яўген Іосіфавіч,** н. у 1923, навучэнец, у студзені 1942 пайшоў у партызанскі атрад імя Варашылава, загінуў 16.9.1942.

**ЧАВУС Рыгор Антонавіч,** н. у 1912, ст. лейтэнант, у красавіку 1942 пайшоў у партызанскі атрад імя Варашылава і загінуў 17.9. 1942.

## Група Ц. Я. Абрамава

**АБРАМАЎ Цімафей Яўсеевіч,** н. у 1918, супрацоўнік МУС, кіраўнік групы з кастрычніка 1941 па жнівень 1943, расстраляны ў жніўні 1943.

**АРЦЮШЭНКА Раман (Рэм) Якаўлевіч,** н. у 1926, навучэнец, расстраляны ў ліпені 1942.

**АРЦЮШЭНКА Тамара Якаўлеўна,** н. у 1928, навучэнка, расстраляна ў ліпені 1942.

**БАЖКО Мікалай Паўлавіч,** н. у 1911, майстар мэблевай фабрыкі, у лютым 1943 пайшоў у партызанскі атрад, у маі схоплены жандармерыяй і расстраляны.

**ГОВАРАЎ Мікалай Міхайлавіч,** н. у 1898, начальнік ветаддзела 26-й арміі, расстраляны ў жніўні 1943.

**ЛАПЕТА Іван Міхайлавіч,** н. у 1907, начальнік упраўлення мясцовай прамысловасці, расстраляны ў снежні 1942.

**МЕЙЛАХ Аляксандр Канстанцінавіч,** н. у 1896, бухгалтар абласнога суда, расстраляны ў студзені 1943.

**ШЭМЕТ Сцяпан Паўлавіч,** н. у 1904, памочнік начальніка аддзела ветэрынарнай службы 26-й арміі, расстраляны ў верасні 1943.

Спіс падрыхтавала
*Т. Піліпчук*

## Мазыршчына партызанская

Канкрэтная праграма разгортвання ўсенароднага змагання з ворагам на акупіраванай ім тэрыторыі была выкладзена ў дырэктыве СНК СССР і ЦК ВКП(б) партыйным, савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей ад 29 чэрвеня 1941 г. і ў спецыяльнай пастанове «Аб арганізацыі барацьбы ў тыле германскіх войск», прынятай ЦК ВКП(б) 18 ліпеня гэтага ж года.

Усёй практычнай работай па стварэнні патрыятычнага падполля і першых партызанскіх атрадаў у Беларусі кіраваў ЦК КП(б)Б. Ім былі распрацаваны і накіраваны на месцы дырэктывы, у якіх кіруючыя партыйныя органы абавязваліся загадзя рыхтавацца да работы ва ўмовах падполля, ствараць базу для разгортвання партызанскага руху.

Ствараліся партызанскія атрады і на тэрыторыі Палескай вобласці. Тут праходзілі важныя чыгуначныя магістралі, наяўнасць вялікіх лясоў таксама спрыяла развіццю партызанскага руху.

Мазыр працяглы час служыў базай для накіравання ў тыл ворага на нелегальную работу ў Пінскую, Мінскую і іншыя вобласці арганізатараў барацьбы з ворагам. Пасля акупацыі Пінска гітлераўцамі 4 ліпеня 1941 г. у Мазыр пераехалі абласныя партыйны і камсамольскі камітэты, адсюль яны накіроўвалі на тэрыторыю Пінскай вобласці сваіх партызан і падпольшчыкаў. Людзі, якія ішлі ў тыл ворага, атрымлівалі тут матэрыяльнае забеспячэнне, вопытных праваднікоў, праходзілі кароткатэрміновае абучэнне.

Другі сакратар Палескага абкама партыі Ф. М. Языковіч, сакратары райкамаў падбіралі кадры і фарміравалі падполле на выпадак акупацыі Мазыршчыны. Як паведамляў у ЦК КП(б)Б першы сакратар абкама П. А. Лявіцкі, ужо да 12 ліпеня 1941 г. у большасці раёнаў вобласці былі арганізаваны падпольныя партыйныя ячэйкі, а ў астатніх яны ствараліся.

23 ліпеня 1941 г. у Мазыры адбылося пасяджэнне бюро Палескага абкама партыі, на якім прысутнічалі сакратары ЦК КП(б)Б В. Г. Ванееў і В. Я. Уласаў, сакратары абкама партыі, кам-



Запіска з фашысцкай турмы. Мазыр, сакавік 1943